**МАРОЗАЎКА** — вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 24 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў — Сураж, 194 км ад Магілёва. На заходняй ускраіне працякае ручай (прыток р. Алешня). Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Краснаполле — Хоцімск.

Заснавана ў 1920-х г. перасяленцамі з суседніх вёсак на былых памешчыцкіх землях. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Касцюковіцкім раёне. У 1940 г. – 37 двароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка – фашысцкія акупанты ў верасні 1943 г. поўнасцю спалілі вёску. Вызвалена 29.09.1943 г. У 1986 г. – 35 гаспадарак, 77 жыхароў, у складзе калгаса імя К.Маркса (цэнтр — в. Відуйцы). Планіровачна складаецца з крывалінейнай, арыентаванай з ПдЗ на ПнУ вуліцы, забудаванай двухбакова, драўлянымі сялянскімі хатамі.